# Не в роскоши счастье (http://www.budni.by/?p=15415)

*Воскресенье, 15.05.2016 08:00. Рубрика: Новости, Общество.   Просмотров: 334*

*Да Міжнароднага дня сям'і*

**Таццяна і Сяргей Давідзюкі прызнаюцца, што васямнаццаць гадоў таму, калі стваралі сям'ю, нават і не падазравалі, што стануць шматдзетнымі бацькамі. Але сёння сям'я з Шарашова выхоўвае шасцёра дзетак.**




Гісторыя гэтай пары здаецца самай звычайнай. Абодва родам з Шарашова, выраслі на адной вуліцы. Але ўвагу на суседскую дзяўчыну Сяргей звярнуў, калі служыў у арміі. Таццяна дачакалася салдата, і, калі служба закончылася, згулялі вяселле.

Маладая сям'я  задумалася пра ўласнае жыллё: вырашылі купіць участак і будаваць дом. За той час, пакуль шчыравалі на будоўлі, у Давідзюкоў падраслі двое дзетак — Ірынка і Вова, ім сёння адпаведна 17 і 15 гадоў. Калі ж перасяліліся, жыльцоў у новым доме паступова пабольшала: Івану ўжо 12, Дзіму — 8, Насці — 5, самаму малодшаму  Міхаілу пакуль няма і двух гадкоў.

— Безумоўна, быць шматдзетнымі бацькамі няпроста, і праблемаў у нас хапае, — кажуць Давідзюкі. —  Але гэта не падстава для роспачы.

Сапраўды, Таццяна і Сяргей ніколі не апускаюць рукі, магчыма, таму, што самі раслі ў сем'ях, дзе выхоўвалася па трое дзяцей.

Найбольш вострае ў шматдзетных бацькоў, канешне, фінансавае пытанне. Сяргей працуе ў «Камунальніку», зарабляе да чатырох мільёнаў рублёў. Таццяна, якая працавала ў школе гардэробшчыцай, пакуль знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці. Дзярждапамогі на дзяцей у сукупнасці не перавышаюць чатырох мільёнаў. Да новага навучальнага года атрымліваюць аднаразовыя дапамогі з работы.

— Зразумела, не галадаем, вельмі выручае падсобная гаспадарка: трымаем карову, свіней, курэй, качак. Газона на прысядзібным участку амаль што няма, усё пад агародам, каб і летам свая агародніна была, і на зіму нарыхтовак зрабіць, — дзеляцца сваімі спосабамі выжывання муж і жонка.

Дапамагаюць спраўляцца з хатнімі клопатамі дзеці: уся работа выконваецца разам — хто за малодшымі сочыць і дома прыбірае, хто едзе сена нарыхтоўваць, хто агарод поле... Летам добрай падмогай для сямейнага бюджэту з'яўляецца збор ягад і грыбоў.

— На ўсе свае «хацелкі» дзеці зарабляюць самі, — расказвае Таццяна. — Напрыклад, Вова — рыбак, заробленыя ў лесе грошы звычайна адкладвае на розныя прынады, Іра, як любая дзяўчынка, хоча прыгожа апрануцца...

Муж і жонка толькі іншы раз здзіўляюцца таму, як ставяцца да шматдзетных сем'яў навакольныя.

— У людзей склаўся нейкі стэрэатып: маўляў, шмат дзяцей — значыць, недагледжаныя. Так, у раскошы не жывём, але нашы дзеці апрануты не горш за астатніх, — кажа Сяргей.

Некалькі гадоў таму Таццяна была ўзнагароджана ордэнам Маці, а зусім нядаўна сям'я атрымала паведамленне, што ім выдзелена двухпакаёвая кватэра ў адной з пружанскіх новабудоўляў.

Хаця складанасцей у вялікай сям'і хапае, Давідзюкі лічаць, што лепш на іх не скардзіцца. Яны проста радуюцца таму, што ім дорыць кожны дзень, поспехам дзяцей. Тым часам проста мараць пра даволі зямныя рэчы, такія, напрыклад, як пакупка аўтамабіля.

— А галоўнае наша жаданне, як любых бацькоў, каб дзеці былі здаровыя і дружныя.

Марына Вакульская